**УДК 791.44.071.1(477)**

***А. В. Бязручка***
*прарэктар па навуковай рабоце Кіеўскага універсітэта культуры,*
*прафесар кафедры кінатэлемастацтва*
*Кіеўскага нацыянальнага універсітэта культуры і мастацтваў,*
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар (Украіна)*

# ПАЧАТАК КІНАПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ УЛАДЗІМІРА ГАРПЕНКІ

*У гэтым артыкуле сабраны і даследаваны невядомыя і малавядомыя старонкі пачатку творчай і кінапедагагічнай дзейнасці вядомага ўкраінскага педагога экранных мастацтваў, кіназнаўцы, рэжысёра кіно і тэлебачання, доктара мастацтвазнаўства (2001) па спецыяльнасцях «Тэорыя і гісторыя культуры» і «Кінематаграфічнае мастацтва, тэлебачанне», прафесара (2002), акадэміка Акадэміі вышэйшай школы, члена Нацыянальнага саюза кінематаграфістаў Украіны Уладзіміра Рыгоравіча Гарпенкі на кінафакультэце Кіеўскага дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва імя І. К. Карпенкі-Карага (цяпер — Інстытут экранных мастацтваў Кіеўскага нацыянальнага універсітэта тэатра, кіно і тэлебачання імя І. К. Карпенкі-Карага).*

***O. V. Bezruchko***
***The start of the cinema-pedagogical activity of Uladzimir Garpenka***
*In this article autor collect and investigate the unknown and not very well-known facts from the beginning of the creative and pedagogical activities of the famous Ukrainian teacher of screen arts, film critic, film and television director, Doctor of Study of Art (2001) with major in two specialties: «Theory and History of Culture» and «Cinematography Art. Television», Professor (2002), Academician of the Academy of Higher School, member of the National Union of Cinematographers of Ukraine Volodymyr Grygorovich Gorpenko at the film faculty of Kyiv State Institute of Theater Arts named after I. K. Karpenko-Kary (now Institute of Screen Arts of Kyiv National University of Theatre, Film and Television named after I. K. Karpenko-Kary).*

Вядомаму ўкраінскаму кінарэжысёру, кіназнаўцу, педагогу экранных мастацтваў, доктару мастацтвазнаўства па спецыяльнасцях «Тэорыя і гісторыя культуры» і «Кінематаграфічнае мастацтва, тэлебачанне», прафесару, акадэміку Акадэміі вышэйшай школы, члену Нацыянальнага саюза кінематаграфістаў Украіны Уладзіміру Рыгоравічу Гарпенку (3 ліпеня 1941 г., сяло Буглак Радомышльскага раёна Жытомірскай вобласці, Украіна — 17 кастрычніка 2019 г., г. Кіеў, Украіна) ўдалося стварыць ва Украіне навуковую школу экранных мастацтваў і медыяпедагогікі. Да гэтай школы належыць і аўтар артыкула, у якога У. Р. Гарпенка быў навуковым кансультантам доктарскай дысертацыі па мастацтвазнаўстве «Фарміраванне кінематаграфічнай школы ва

Украіне: тэарэтычныя, практычныя і мастацкія асновы (трыццатыя — шасцідзясятыя гады XX стагоддзя)».

Навуковую, творчую і кінапедагагічную дзейнасць У. Р. Гарпенкі вывучалі І. Зубавіна [1], С. Трымбач [2], І. Журавель [3], А. Бязручка [4–7, 8] і інш. Тым не менш у сувязі з яго смерцю новыя даследаванні з'яўляюцца надзвычай актуальнымі.

У. Р. Гарпенка спачатку вучыўся ў майстэрні тэатральных акцёраў і рэжысёраў М. П. Вярхацкага, потым у першай ва Украіне кінарэжысёрскай майстэрні В. І. Іўчанкі на кінафакультэце Кіеўскага дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва (КДІТМ — КГИТИ) імя І. К. Карпенкі-Карага (цяпер — Інстытут экранных мастацтваў Кіеўскага нацыянальнага ўніверсітэта тэатра, кіно і тэлебачання імя І. К. Карпенкі-Карага).

Як успамінаў У. Р. Гарпенка на вечары памяці В. І. Іўчанкі, пасля выпускных экзаменаў настаўнік патэлефанаваў яму дамоў у чвэрць першага ночы і спытаў, ці не змог бы Гарпенка зараз прыехаць да яго. Віктар Іларыёнавіч Іўчанка, апрануты ў спартыўны касцюм, папрасіў прабачэння за позняе запрашэнне і прапанаваў свайму былому студэнту ў дзесяць раніцы быць побач з ім у прыёмнай камісіі КДІТМ [9].

Так пачалася педагагічная кар'ера будучага выдатнага ўкраінскага кінапедагога, доктара мастацтвазнаўства, прафесара Уладзіміра Рыгоравіча Гарпенкі. Дастаткова плённая, дарэчы, таму што на яго рахунку тры дзясяткі кніг па тэорыі і практыцы кінамастацтва, шматлікія выступленні на навуковых семінарах і канферэнцыях і, галоўнае, шэраг вучняў, якія актыўна працуюць у экранных мастацтвах.

Уладзімір Гарпенка адначасова з вучобай у аспірантуры ва Усесаюзным дзяржаўным інстытуце кінематаграфіі (УДІК — ВГИК, цяпер — Усерасійскі дзяржаўны ўніверсітэт кінематаграфіі імя С. А. Герасімава) працаваў старшым выкладчыкам кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання КДІТМ імя І. К. Карпенкі-Карага.

Восенню 1972 г. у г. Растове падчас выбару натуры для здымак наступнага фільма памёр В. І. Іўчанка. Позняй ноччу яго вучні сустрэлі ў аэрапорце самалёт, пачаўшы трагічны рытуал развітання, які цягнуўся аж да моманту пахавання яго цела на Байкавых могілках. Страшны боль не дазваляў гаварыць словы падзякі і абяцанні працягваць станаўленне нацыянальнай кінашколы ва Украіне, што ўсім сваім жыццём сцвярджаў Віктар Іларыёнавіч Іўчанка. Настаўніку У. Р. Гарпенка прысвяціў артыкул «Урокі, атрыманыя ў дарозе» [10].

Выкладчыцкую эстафету, у прыватнас мастацкае кіраўніцтва гэтай майстэрняй, даручылі кінарэжысёру, сцэнарысту, заслужанаму дзеячу мастацтваў УССР (1967) Уладзіміру Захарыевічу Доўганю.

Педагагічная дзейнасць Уладзіміра Гарпенкі таксама звязана з вядомым украінскім кінарэжысёрам, педагогам, першым сакратаром Саюза кінематаграфістаў, Народным артыстам СССР (1972), лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Украінскай ССР імя Т. Р. Шаўчэнкі (1971), лаўрэатам прэміі Саюза кінематаграфістаў Украіны (1982), узнагароджаным Залатым медалём імя А. П. Даўжэнкі (1982) Цімафеем Васільевічам Ляўчуком, у майстэрні якога У. Р. Гарпенка самастойна распрацаваў шэраг спецкурсаў.

Ц. В. Ляўчук заўсёды ўмеў стварыць творчы калектыў педагогаў-аднадумцаў, смела прыцягваў да працы творчую моладзь, нядаўніх выпускнікоў, давяраючы ім працу з курсам ў якасці другога педагога.

Уладзімір Гарпенка ў пачатку 1980-х гг. пісаў у аўтабіяграфіі: «За мінулы перыяд зроблены два выпускі кінарэжысёраў. Першы — агульная акцёрска-рэжысёрская майстэрня (мастацкі кіраўнік В. І. Іўчанка, потым У. З. Доўгань). Другі — майстэрня кінарэжысуры (мастацкі кіраўнік — Ц. В. Ляўчук)» [11].

З 1981 г. У. Р. Гарпенка выкладаў на курсе кінарэжысёраў ужо «трэцяга пакалення», мастацкім кіраўніком якіх быў прафесар Ц. В. Ляўчук. Тады дзверы кінафакультэта КДІТМ адкрыліся для студэнтаў-замежнікаў. Папярэдні год яны вучыліся рускай мове ў Кіеўскім універсітэце імя Тараса Шаўчэнкі, а потым адбывалася іх тэсціраванне, персанальная размова з мэтай вызначэння, ці маюць яны адпаведны творчы патэнцыял.

Адбор студэнтаў-замежнікаў і даручылі Уладзіміру Гарпенку, які пасля ўступных экзаменаў увесь першы семестр быў задзейнічаны на кінавытворчасці, а таму заняткі са студэнтамі пачаў толькі з другога семестра.

Той курс быў незвычайным па сваім складзе: па-першае, ён быў беспрэцэдэнтна вялікім — 19 студэнтаў; па-другое, на ім, акрамя 7 савецкіх студэнтаў, займалася 12 студэнтаў з 11 краін. Гэты аспект, паводле слоў Уладзіміра Рыгоравіча, наклаў свой адбітак на ўсю вучэбна-метадычную і выхаваўчую працу з курсам. У першую чаргу, трэба было прывесці да агульнага назоўніка надзвычай разнастайны курс, аб’яднаць іх у агульнасць адзінай майстэрні [12].

Асноўны акцэнт малады, але ўжо досыць дасведчаны педагог рабіў на вучэбна-лекцыйнай працы, пачаўшы выкладаць з тэарэтычных раздзелаў курса «Кінарэжысура»: «Уводзіны ў кінарэжысуру», «Праца з акцёрам», «Мантаж», «Кампазіцыя фільма», «Жанр і стыль», «Кінамізансцэна» і г. д.

Гэтаму ж заданню падпарадкоўвалася і індывідуальная праца са студэнтамі — выбар і асэнсаванне матэрыялу, пошук глыбокага і выразнага мастацкага рашэння, арганізацыйнае і паслядоўнае засваенне ўсіх элементаў прафесіі.

Але асабліва карысным было, па перакананні Уладзіміра Гарпенкі, тое, што і на першым, і на другім курсах атрымалася адабраць для сцэнічных рэжысёрска-акцёрскіх работ матэрыял, які даў магчымасць выконваць канкрэтныя вучэбна-метадычныя заданні па засваенні рамяства і выхоўваць пачуццё калектыўнай адказнасці і ўзаемадапамогі. Гэта кампазіцыі па сцэнарыі і аповесці Ж. Рэмі «Калі хлопцы ўсяго свету» — на першым курсе, а таксама па паэме М. Гогаля «Мёртвыя душы» — на другім курсе.

На дасягненне гэтай жа мэты быў накіраваны і распачаты на трэцім курсе педагагічны эксперымент — сумесная праца рэжысёрскай майстэрні над сцэнічнымі ўрыўкамі з другім акцёрскім курсам КДІТМ, мастацкім кіраўніком якой быў А. Р. Рашэтчанка.

Большай часткай курс працаваў рытмічна, укладваючыся з практычнымі заняткамі (у прыватнасці, на здымачных работах, што пры такім складзе курса занадта складана) у вызначаныя праграмай і вучэбным планам тэрміны.

Інтэнсіўная выхаваўчая праца вялася на гэтым інтэрнацыянальным курсе. Па тагачаснай педагагічнай методыцы рэгулярна арганізоўвалася правядзенне палітінфармацыі, дзе разам з савецкімі прымалі актыўны ўдзел і замежныя студэнты. Акцэнт там рабіўся, перш за ўсё, на расповедах студэнтаў аб сваёй радзіме, што давала добры педагагічны вынік праз узаемаўзбагачэнне культур і ўсталяванне добрых адносін паміж студэнтамі майстэрні. Звычайна такія сустрэчы-гутаркі суправаджаліся паказам разнастайнага ілюстрацыйнага матэрыялу — фотаздымкаў, рэпрадукцый, слайдаў, што надавала гісторыям агульнаазнаямляльны эфект, вельмі патрэбны ў станаўленні маладых рэжысёраў.

Актыўная грамадзянская пазіцыя, у лепшым сэнсе гэтага слова, заўсёды была ўласцівай Уладзіміру Гарпенку. Як член грамадска-метадычнай рады Бюро прапаганды савецкага кінамастацтва ён праводзіў велізарную колькасць шэфскіх сустрэч і лекцый. Так, напрыклад, толькі ў 1982–1983 гг. сустрэчы адбыліся ў гарадах Горкі, Ніжневартаўск, Нафтаюганск, Табольск, Томск, Львоў і інш.

Майстар спрабаваў развіць у студэнтаў шырыню кругагляду, запал да спазнання ўсяго, што можа спатрэбіцца ў будучай творчай працы, таму, напрыклад, ён арганізаваў наведванне маладымі рэжысёрамі Навукова-даследчага інстытута «Укргазпраект», дзе ім была прадэманстравана праца

электронна-вылічальнай тэхнікі для праектавання шырока вядомага ў той час газаправода «Урэнгой–Памары–Ужгарад».

Мелі пазітыўны ўплыў на педагагічны працэс у майстэрні і сустрэчы студэнтаў на здымачнай пляцоўцы з рэжысёрамі кінастудыі імя А. Даўжэнкі. Магчыма, першым крокам да педагагічнай кар'еры кінарэжысёра Міхаіла Гарасімавіча Ільенкі, які працаваў тады над экранізацыяй «Старасвецкіх памешчыкаў» М. В. Гогаля (фільм выйшаў у 1983 г. пад назвай «Міргарад і яго жыхары»), можна лічыць сустрэчу-лекцыю са студэнтамі кінафакультэта КДІТМ, арганізаваную У. Р. Гарпенкам.

У выхаваўчай рабоце, якая праводзілася майстрам на курсе, самая вялікая ўвага надавалася індывідуальным формам. Пастаянныя гутаркі, наведванне інтэрната, дапамога ў арганізацыі побыту і вольнага часу, агульныя наведванні выстаў, музеяў, спектакляў — уся пазапраграмная праца была накіравана на фарміраванне ў студэнтаў шырокага самастойнага светапогляду, пачуцця моднага тады інтэрнацыяналізму, густу, а галоўнае — на аб'яднанне курса ў адзіную каманду сяброў.

Нягледзячы на тое, што ў майстэрні былі прадстаўлены ўсе рэлігіі і асноўныя канфесіі свету з розных краін — Манголія, Тога, Іспанія, Дамініканская Рэспубліка, Венесуэла, Коста-Рыка, Партугалія, Польшча, Йемен, Панама, Іарданія, Бангладэш, Ірак і Украіны (сямёра прадстаўнікоў), Ц. В. Ляўчуку і У. Р. Гарпенку ўдалося гэты «Вавілон» прывесці да адной роўніцы. Курс, па словах Уладзіміра Гарпенкі, паказаў дыпломны спектакль на такім узроўні, якога не ведалі нават прафесійныя тэатры [12].

З дыпломных стужак студэнтаў майстэрні больш за ўсё запомніліся працы іракца Лейта Кадума і дзяўчыны з Йемена Йіўхам Абдо. Лейта Кадум зняў паэтычную паэму па матывах Гарсіі Лоркі. А мініяцюрная далікатная Йіўхам стварыла фільм-прыпавесць «Гульня», дзе чалавецтва прыпадабняецца легкадумнай дзятве, якая гуляецца са смяротнай зброяй, нягледзячы на трагічныя наступствы такіх забаў.

На працягу доўгіх гадоў гэтыя кінарэжысёры не толькі падтрымлівалі сувязь са сваім настаўнікам, але і працягвалі вучыцца ў яго. Так, напрыклад, іракскі рэжысёр Кадум Леон Лейта (Лейта Абдул Амір), які жыве і здымае дакументальныя фільмы ў Францыі, пад кіраўніцтвам Уладзіміра Рыгоравіча Гарпенкі напісаў кандыдацкую дысертацыю «Асаблівасці рэжысуры экстрымальнага дакументальнага фільма», якую ў 2018 г. паспяхова абараніў у Інстытуце мастацтвазнаўства, фалькларыстыкі і этналогіі імя Максіма Фадзеевіча Рыльскага Нацыянальнай акадэміі навук Украіны [13].

Як і яго настаўнік, выхоўваючы іншых, У. Р. Гарпенка заўсёды вучыўся сам. Так, напрыклад, для азнаямлення з метадалогіяй выкладання дысцыпліны майстэрства акцёра ўжо дасведчаны педагог па некалькі месяцаў праводзіў у розных мастацкіх інстытутах Савецкага Саюза, сярод якіх можна назваць студыю ВНУ імя Вахтангава, студыю-школу імя Неміровіча-Данчанкі, УДІК (ВГИК), ДІТМ (ГИТИС) і інш.

Такім чынам, у артыкуле дэталёва разгледжаны пачатак кінапедагагічнай дзейнасці У. Р. Гарпенкі, звязанай з кінафакультэтам КДІТМ імя І. К. Карпенкі-Карага. У наступных публікацыях неабходна даследаваць яго педагагічную дзейнасць у Кіеўскім філіяле Усесаюзнага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў тэлебачання і радыёвяшчання, Кіеўскім міжнародным універсітэце, Кіеўскім нацыянальным універсітэце культуры, Інстытуце экранных мастацтваў імя Івана Мікалайчука, які ён заснаваў і дзе на працягу дзесяці гадоў быў рэктарам, Кіеўскім універсітэце культуры, загадчыкам кафедры кіна-, тэлемастацтва якога ён быў да самай смерці.

***© Пераклад з украінскай мовы С. В. Венідзіктава***

1. Зубавіна І. Б. Кінематограф незалежної України: тенденції, фільми, постаті. Київ, 2007. 296 с. Вернуться к статье

2. Тримбач С. В. Горпенко Володимир Григорович // Енциклопедія Сучасної України / Національна академія наук України, Наукове товариство ім. Шевченка, Інститут енциклопедичних досліджень НАН України. Київ, 2008. Т. 6 : Го–Гю. С. 308. Вернуться к статье

3. Журавель І. Інтерв'ю з ректором Інституту екранних мистецтв ім. І. Миколайчука В. Г. Горпенком // Помічник абітурієнта. 2008. № 9. С. 28–29. Вернуться к статье

4. Безручко А. Позоришни тренинг Владимира Горпенка // Аудіовізуальне мистецтво і виробництво : матеріали IV круглого столу, 10 квітня 2019 р., м. Київ. Київ : Видав. центр КНУКіМ, 2019. С. 11–14. Вернуться к статье

5. Безручко А. Виктор Ивченко като идеален учител за Владимир Горпенко // Матеріали V круглого столу «Аудіовізуальне мистецтво і виробництво», 3 лют. 2020 р., м. Київ. Київ : Видав. центр КНУКіМ, 2020. С. 12–15. Вернуться к статье

6. Бязручка А. Вядомы ўкраінскі медыяпедагог У. Г. Гарпенка (да 75-годдзя з дня нараджэння) // Медиасфера и медиаобразование: специфика взаимодействия в современном социокультурном пространстве [Электронный ресурс] : сб. ст. / М-во внутр. дел Респ. Беларусь, учреждение образования «Могилевский институт Министерства внутренних дел Республики Беларусь» ; редкол.: С. В. Венидиктов (отв. ред.) [и др.]. Могилев : Могилев. институт МВД, 2017. С. 43–48. 1 электрон. опт. диск (CD-R). Вернуться к статье

7. Бязручка А. Творчая дзейнасць у кінематографе і на тэлебачанні роданачальніка ўкраінскай медыяпедагогікі У. Р. Гарпенкіа // Thesaurus : зб. навук. прац / Магілёў. ін-т МУС Рэсп. Беларусь ; пад агул. рэд. С. В. Венідзіктава,

В. Д. Выбарнага. Магілёў, 2017. Вып. IV: Міждысцыплінарныя даследаванні. С. 51–58. Вернуться к статье

8. Bezruchko O. Legend of the Ukrainian audiovisual directing and cinema pedagogics Volodymyr Gorpenko // Problem space of modern society: philosophical-communicative and pedagogical interpretations: collective monograph. Part I. Warsaw: BMT Erida Sp. z o.o, 2019. P. 316–329. Вернуться к статье

9. Горпенко В. Г. Воспоминания о В. И. Ивченко на вечере памяти, ноябрь 2002 г. // Частный архив автора. Вернуться к статье

10. Горпенко В. Уроки, здобуті в дорозі. До 70-річчя від дня народження В. І. Івченка // Культура і життя. 1982. № 46. С. 5. Вернуться к статье

11. Горпенко В. Г. Автобиография, 9 сентября 1983 г. // Архив КНУТКТ им. И. К. Карпенко-Карого. Личное дело В. Г. Горпенко. Вернуться к статье

12. Горпенко В. Г. Интервью о педагогической деятельности, март 2003 г. // Частный архив автора. Вернуться к статье

13. Кадум Л. Л. Особливості режисури екстремального документального фільму : автореф. дис. ... канд. мистецтвознавства : 17.00.04 ; НАН України, Ін-т мистецтвознавства, фольклористики та етнології ім. М. Т. Рильського. Київ, 2018. 20 с. Вернуться к статье